View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

Ладысеў, У.Ф. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове ва ўмовах курсу кіраўніцтва Савецкай Расіі на сусветную пралетарскую рэвалюцыю (1918-1920 гг.) / У. Ф. Ладысеў //Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 29–35

***У. Ф. ЛАДЫСЕЎ***

# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ НА САВЕЦКАЙ АСНОВЕ ВА ЎМОВАХ КУРСУ КІРАЎНІЦТВА САВЕЦКАЙ РАСІІ НА СУСВЕТНУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ (1918 — 1920 гг.)

У беларускай гістарыяграфіі ўсталяваўся некалькі ідэалізаваны падыход да праблемы станаўлення беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Ён зводзіцца да спрошчанай фабулы, што, як толькі тэрыторыя Беларусі была ачышчана ад войск кайзераўскай Германіі, ЦК РКП(б) у снежні 1918 г. прыняў рашэнне аб стварэнні БССР. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) такое рашэнне падтрымала. Беларускімі гісторыкамі не зварочвалася ўвага на тое, што ў парадку дня канферэнцыі пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі наогул не стаяла.



Наўрад таксама можна пагадзіцца з тэзісам, што БССР была створана «ў піку» існуючай БНР. Бо адразу ж узнікае пытанне: чаму БССР не была абвешчана адразу ж пасля заняцця Мінска войскамі Чырвонай Арміі 10 снежня 1918 г., а значна пазней?

Станаўленне дзяржаўнасці Беларусі на савецкай аснове адбывалася не менш складана і драматычна, чым БНР. Нягледзячы на прынятую 2 лістапада 1917 г. «Дэкларацыю правоў народаў Расіі», уладныя структуры РСФСР вясной-летам 1918 г. не ішлі далей пазіцыі абласніцтва ў вырашэнні нацыянальнага пытання. Так, адміністрацыйная камісія УЦВК РСФСР прапанавала на тэрыторыі былой царскай Расіі ліквідаваць усялякі нацыянальны падзел і стварыць акрамя Маскоўскай яшчэ тры вобласці (камуны): Заходнюю, Паўночную і Уральскую. Заходнюю вобласць меркавалася стварыць у складзе Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Чарнігаўскай, Віленскай і Ковенскай губерняў з абласным цэнтрам у Мінску.

Аднак уладныя структуры Расійскай федэрацыі не маглі не лічыцца з пазіцыяй левага крыла нацыянальна-вызваленчага руху Беларусі: З. Жылуновічам, А. Чарвяковым, І. Лагуном, Я. Дылам, Б. Тарашкевічам і інш., якія ў пачатку 1918 г. склалі аснову Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама), створанага ў адпаведнасці з дэкрэтам У. Леніна ад 31 студзеня 1918 г. Разам з беларускімі секцыямі РКП(б) Белнацкам вёў палітычную і культурна-асветніцкую работу сярод беларусаў на тэрыторыі Савецкай Расіі. Менавіта пад уплывам гэтых арганізацый ідэя ўтварэння Беларускай Савецкай Рэспублікі набывала ўсё большую падтрымку.

Але імкненні да беларускай дзяржаўнасці нават на аўтаномных пачатках поўнасцю ігнараваліся кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыкамзаха, якое знаходзілася ў Смаленску, на працягу ўсяго 1918 г. Аблвыкамзах адмаўляў нават пачатковую форму нацыянальнай дзяржаўнасці Беларусі — абласную аўтаномію, прапанаваную Белнацкамам. Ідэі стварэння дзяржаўнасці проціпастаўляўся лозунг інтэрнацыянальнага адзінства працоўных Заходняй вобласці ў барацьбе з буржуазіяй.

Таму ў другой палове 1918 года ўсё больш нарасталі непаразуменні паміж Паўночна-Заходнім абкомам РКП(б), з аднаго боку, Белнацкамам і беларускімі секцыямі РКП(б) — з другога.

На наш погляд, праблему дзяржаўнасці нельга правільна зразумець толькі зыходзячы з унутранных фактараў і супярэчнасцей. Яе неабходна разглядаць у кантэксце новай геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе, што ўтварылася ў сувязі з паражэннем Германіі ў I сусветнай вайне, і спробамі кіраўніцтва Савецкай Расіі экспартаваць сацыялістычную рэвалюцыю ў краіны Еўропы, у першую чаргу ў Германію і Польшчу. Так, атрымаўшы першыя звесткі



аб палітычным крызісе ў Германіі, Ленін 3 кастрычніка 1918 г. пісаў: «Крызіс у Германіі толькі пачаўся. Ён закончыцца непазбежным пераходам палітычнай улады ў рукі германскага пралетарыяту... Цяпер нават самыя асляплёныя з рабочых розных краін убачаць, як правы былі бальшавікі, якія ўсю тактыку будавалі на падтрымку сусветнай пралетарскай рэвалюцыі і не баяліся прыносіць розныя найцяжэйшыя ахвяры»[1].

У сувязі са стаўкай савецкага кіраўніцтва на перамогу пралетарскай рэвалюцыі ў Цэнтральнай Еўропе Беларусь разглядалася як своеасаблівы калідор, праз які ідзе найбольш прамы шлях па аказанні ваеннай дапамогі пралетарыяту Германіі і Польшчы. Становіцца зразумелым, чаму перадача немцамі Мінска савецкім уладам 10 снежня не прывяла да абвяшчэння Беларускай савецкай рэспублікі. У выдадзеным у гэты дзень загадзе Мінскага губрэўкома «члены Рады БНР і яе агенты падлягалі арышту і неадкладнай перадачы ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта»[2].

Невыпадкова ў прынятай 2 снежня пастанове Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) аб скліканні 27 снежня 1918 г. у Смаленску VI чарговай абласной партыйнай канферэнцыі пытання аб абвяшчэнні Беларускай савецкай рэспублікі не значылася. І хаця Мінскі губрэўком 13 снежня ў тэлеграме Старшыні УЦВК РСФСР і сакратару ЦК РКП(б) Я. Свярдлову прапанаваў уключыць у парадак дня абласной партыйнай канферэнцыі пытанне аб утварэнні Беларускай савецкай рэспублікі, тэлеграма засталася без адказу.

Нігілістычная пазіцыя цэнтральнага савецкага кіраўніцтва і функцыянераў Заходняй вобласці ў адносінах да дзяржаўнасці Беларусі вызвала занепакоенасць Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б). На канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), што адбылася ў Маскве 21—23 снежня, было прызнана неабходным стварыць Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі, абраць Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б) з ліку прыхільнікаў тэрміновага стварэння беларускай дзяржаўнасці ў складзе пяці чалавек на чале з З. Жылуновічам. Прычым Цэнтральнаму бюро даручалася склікаць пасля VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі Усебеларускі з’езд камуністаў і стварыць нацыянальны партыйны цэнтр.

Прынятыя канферэнцыяй дакументы фактычна паставілі ЦК РКП(б) перад неабходнасцю тэрмінова вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасці. Да таго ж разлік Леніна, што польская нацыянальная буржуазія не зможа пратрымацца пасля адыходу нямецкіх акупацыйных войскаў, не апраўдаўся. Было вырашана неабходным стварыць уздоўж заходняй мяжы Расіі своеасаблівы «санітарны кардон» з ліку прыбалтыйскіх рэспублік, створанай раней Украінскай рэспублікі, а таксама Беларускай савецкай рэспублікі.



24 снежня праблема дзяржаўнасці Беларусі разглядалася ў ЦК РКП(б). На сённяшні дзень застаецца адкрытым пытанне, на якім узроўні прымалася рашэнне ў Цэнтральным камітэце. Аўтары вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі», ч. II. Мн., 1998, памылкова сцвярджаюць аб пленуме ЦК РКП(б), што быццам бы адбыўся 24 снежня. Дакументальнага пацвярджэння аб гэтым пленуме ці аб пасяджэнні ЦК РКП(б) 24 снежня не выяўлена. Магчыма, старшыня Наркамнаца РСФСР І. Сталін у сваёй размове па тэлефоне з А. Мясніковым 25 снежня, спасылаючыся на рашэнне ЦК, выконваў асабістае ўказанне Леніна па беларускім пытанні.

У той жа дзень Сталін запрасіў да сябе на размову адказных супрацоўнікаў Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б), у ходзе якой прапанаваў скласці спіс кандыдатаў на замяшчэнне пасад у Часовым рабоча-сялянскім урадзе Беларусі. Праз два дні, 27 снежня, Сталін правёў нараду ў Маскве з кіраўнікамі Паўночна-Заходняга абкома РКП(б) і Аблвыкамзаха Мясніковым і Калмановічам, на якой была акрэслена тэрыторыя Беларускай рэспублікі з пяці губерняў: Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай, а таксама вызначаны склад новага ўрада (старшыня і 15 членаў) і паўнамоцтвы рэспублікі.

На VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б), якая пачала работу 30 снежня ў Смаленску, у даклад А. Мяснікова па пытанні «Бягучы момант» быў уключаны пункт «Беларуская Савецкая Рэспубліка». Ён змяшчаў прапанову «абвясціць Заходнюю Камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай». У якасці аргумента вылучаўся міжнародны фактар «замкнуць ланцуг самавызначыўшыхся ўтварэнняў»[3]. Дэлегаты пагадзіліся з такой прапановай і без абмеркавання аднагалосна прынялі яе. Пяць дэлегатаў устрымаліся. У пастанове аб тэрыторыі рэспублікі асноўным ядром яе лічыліся Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская губерні з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населеных пераважна беларусамі.

Аднак у гэтых межах ССРБ праіснавала толькі два тыдні. Паміж прыхільнікамі З. Жылуновіча і А. Мяснікова разгарнуліся вострыя спрэчкі ў сувязі з фарміраваннем Часовага ўрада рэспублікі. Канфлікт паміж імі асабіста ўладжваў Сталін, які меў намер прыехаць у Мінск у пачатку студзеня, але па прапанове ЦК РКП(б) быў адкамандзіраваны на Усходні фронт у сувязі з крытычнай сітуацыяй, якая там склалася. У тэлеграме да кіраўнікоў ССРБ ён пісаў: «Праз 10 дзён буду ў Вас, вядзіце сябе спакойна і не біцеся, а то будзе дрэнна»[4].

Парада не была выпадковай, бо немнагаслоўны Сталін ведаў больш, чым казаў.



Аднак Сталін затрымаўся на фронце не на дзесяць, а больш чым на дваццаць дзён. У яго адсутнасць у Беларусь быў накіраваны ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) і член Цэнтральнага Камітэта А. Іофэ з шырокімі паўнамоцтвамі. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў адмоўнае для беларускай дзяржаўнасці рашэнне

забраць у толькі што створанай Беларускай Рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні і ўключыць іх у склад РСФСР, а Мінскую і Гродзенскую губерні аб’яднаць з Літоўскай ССР. На пасаду старшыні ЦВК будучай ЛітБел планаваўся непасрэдна А. Іофэ.

Адзін з галоўных ініцыятараў утварэння ЛітБела старшыня УЦВК і сакратар ЦК РКП (б) Я. Свярдлоў у тэлеграме ад 30 студзеня ў ЦК КП Літвы безапеляцыйна сцвярджаў, што на з’ездзе Саветаў Беларусі будзе вынесена рашэнне аб аб’яднанні Беларусі з Літвой. Таму прапаноўваў «літоўскім таварышам як можна хутчэй склікаць свой з’езд і правесці там тое ж рашэнне»[5].

Аднак супраць штучнага дзялення этнічнай Беларусі пратэставалі не толькі група З. Жылуновіча, але А. Мяснікоў і яго прыхільнікі. Аб гэтым сведчыць пратакол пасяджэння Цэнтральнага бюро КП(б) Беларусі ад 22 студзеня, на якім прысутнічаў Іофэ. Усе 8 членаў Бюро адхілілі прапанову Іофэ аб падзеле тэрыторыі рэспублікі і вырашылі звярнуцца ў ЦК РКП(б) з просьбай перарашыць пытанне аб усходніх губернях Беларусі [6].

Таму Іофэ ў пісьме Свярдлову ад 28 студзеня адзначыў, што абедзве групы нікуды не вартыя. Беларусы, ці група Жылуновіча, — нацыяналісты, а Мяснікоў і яго прыхільнікі, хаця не нацыяналісты, але сепаратысты яшчэ горшай маркі. І раіў разагнаць іх, паслаць на працу куды-небудзь далей ад Беларусі.

Аднак ідэя дзяржаўнасці Беларусі знаходзіла ўсё большую колькасць сваіх прыхільнікаў і сярод савецка-партыйнага актыву былой Паўночна-Заходняй вобласці. Гэтыя настроі яскрава выявіліся на Мінскай губернскай партыйнай канферэнцыі, якая адбылася ў канцы студзеня 1919 г. У прынятай рэзалюцыі канферэнцыі за подпісамі членаў Бюро І. Рэйнгольда, Р. Найдзенкава і В. Кнорына выказваўся недавер прадстаўніку ЦК РКП(б) Іофэ і патрабаванне адазваць яго з Беларусі. Сур’ёзныя папрокі ў адміністраванні былі зроблены і ў адрас Свярдлова.

Такая пазіцыя савецка-партыйнага кіраўніцтва Беларускай рэспублікі вызвала сур’ёзны непакой у ЦК РКП(б). Урэгуляванне канфлікту было ўскладзена на Сталіна, які ад імя Цэнтральнага камітэта РКП(б) адобрыў дзейнасць Іофэ ў Беларусі і патрабаваў ад членаў Цэнтральнага бюро КП(б) Б, якія падпісалі рэзалюцыю, перагледзець свае пазіцыі. У той жа час у тэлефанаграме савецкаму ўраду Літвы ён паведамляў, што на кандыдату-



ры Іофэ на пасаду старшыні ЦВК ЛітБела «не настойваем, няхай будзе Ціхоўскі».

Невыпадкова, што ў працы І Усебеларускага з’езда Саветаў 2—3 лютага 1919 г. прыняў непасрэдны ўдзел Свярдлоў. У дакладзе асноўны акцэнт ён зрабіў на ахапіўшую краіны Еўропы быццам бы сусветную пралетарскую рэвалюцыю і неабходнасць адзінства ў гэтых умовах пралетарыяту Беларусі, Літвы і Расіі. З’езд Саветаў прадубліраваў прынятае раней у Маскве рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай савецкай Рэспублікі.

27 лютага 1919 г. у Вільні на аб’яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай ССР было прынята рашэнне аб аб’яднанні рэспублік Літва і Беларусь.

З утварэннем гэтай штучнай дзяржаўнасці як бы здымалася з павесткі дня пытанне аб правамернасці далучэння этнічных беларускіх зямель да РСФСР.

У склад новага ўрада ЛітБела З. Жылуновіч не ўвайшоў, бо ў пачатку лютага быў накіраваны на журналісцкую працу ў Харкаў. А. Мяснікоў у маі 1919 г. быў камандзіраваны на Усходні фронт у рангу камандуючага Паволжскім фронтам. Яшчэ трагічней склаўся лёс Р. Найдзенкава, які на І Усебеларускім з’ездзе Саветаў быў абраны членам ЦВК БССР і яго Прэзідыума, а ў сакавіку членам ЦК КП(б) ЛіБ. У маі 1919 г. паводле пастановы ЦВК ЛітБела ён быў арыштаваны і расстраляны Вярхоўным рэвалюцыйным трыбуналам ЦВК ЛітБела па абвінавачанні ў тым, што выдаваў сябе за члена РСДРП з 1906 г., адказныя пасады ў Заходняй вобласці выкарыстоўваў для сваёй выгады.

Такі сумны вынік першапачатковага этапу стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Тагачаснаму савецкаму і партыйнаму актыву Беларусі быў дадзены прадметны ўрок пралетарскага інтэрнацыяналізму. Ён наклаў свой адмоўны адбітак на пазіцыю кіраўнікоў Мінскага губрэўкома ў ліпені 1920 г., калі ў другі раз вырашалася пытанне аб абвяшчэнні ССРБ і яе тэрыторыі, што таксама атрымала скажонае асвятленне ў беларускай гістарыяграфіі.

Пасля вызвалення 11 ліпеня 1920 г. Мінска, а затым большай часткі тэрыторыі Беларусі ад польскіх войск для падрыхтоўкі дэкларацыі аб абвяшчэнні ў другі раз беларускай дзяржаўнасці была створана камісія. У склад яе ўвайшлі 4 прадстаўнікі ад БПС-Р (Я. Бялькевіч, П. Берднік, У. Мамонька і М. Пашковіч), 2 ад КП(б) ЛіБ (А. Чарвякоў і В. Кнорын), ад БКА — У. Ігнатоўскі, ад Бунда — А. Вайнштэйн. На першым сходзе камісіі былі пастаўлены ў парадак дня пытанні аб межах Беларусі, адносін да суседзяў, дзяржаўна-палітычным ладзе Беларусі, эканамічныя і іншыя.



Галоўным разыходжаннем БПС-Р з пазіцыяй камуністаў з’явілася пытанне аб межах Беларусі. Прадстаўнікі БПС-Р настойвалі, каб у акце абвяшчэння незалежнасці Беларусі быў ясна акрэслены прынцып

этнічнага самавызначэння. Аднак прадстаўнік камуністаў В. Кнорын адказаў, што яны «не могуць дапусціць, каб Смаленская, Магілёўская і Віцебская губерні адышлі да Беларусі, таму што жывуць там рускія людзі і што там няма беларусаў»[7]. Прадстаўнікі БПС-Р афіцыйна заявілі, што пад такой Дэкларацыяй аб аб'яўленні незалежнасці ССРБ яны сваіх подпісаў не паставяць, а таксама адмовіліся ўвайсці ў склад Часовага рэвалюцыйнага камітэта.

ЦК КП(б) ЛіБ выказаўся за разрыў адносін з беларускімі эсэрамі. Далейшая гістарычная рэчаіснасць паказала шкоднасць такой палітычнай лініі. Ва ўмовах, калі пачаліся перагаворы ў Рызе паміж расійскай і польскай дэлегацыямі аб умовах прэлімінарнага мірнага дагавора, патрэбна была лінія на аб'яднанне палітычных сіл, якія адстойвалі тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі.

Таму невыпадкова беларуская нацыя і яе этнічная тэрыторыя аказаліся раздзеленымі на доўгі час на тры часткі. Як суверэнная дзяржава Беларуская рэспубліка існавала пасля другога абвяшчэння ў межах толькі шасці паветаў былой Мінскай губерні (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, часткова Мінскі і Слуцкі). Яе плошча складала 52,4 тыс. км$^2$, а насельніцтва 1 544 000 чалавек.

---

1 *Ленін У. І.* Поўны збор твораў. Т. 30. С. 97—98.

2 Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 — июль 1920) // Сб. документов и материалов. Мн., 1961.

3 Пратакол I з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Менск, 1934. С. 13.

4 Расійскі цэнтр захоўвання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі (РЦЗ і ВДНГ). Ф. 3. Воп. 6. Спр. 4671. Арк. 1.

5 *Свердлов Я. М.* Избр. произв.: В 3 т. М., 1960. Т. 3. С. 143.

6 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 20—21.

7 Бюлетэнь загранічнай групы Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. 1926. № 3—4 (студз. — сак.). С. 14—15.